ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
7
СТУДЗЕНЯ
№ 1 (1559)

Беларускі універсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### «ТВОЙ УКЛАД У ПЕРАБУДОВУ»

— пад такім дэвізам пачалася ў канцы мінулага года атэстацыя камуністаў, якая пройдзе ў кожнай партыйнай арганізацыі універсітэта і закончыцца сёлета. Мэта яе — выявіць, ці адпавядае камуніст свайму высокаму званню і які ўклад уносіць ён у справу перабудовы.

Ж. КРУГЛІКАВА.

### АБ СТАНЕ І МЕРАХ

па ўдасканаленню выкладання грамадскіх навук ішла размова ў паведамленні прарэктара па вучэбнай рабоце, прафесара У. С. Багданава на чарговым пасяджэнні вучонага савета БДУ імя У. І. Леніна.

Дэкан фізічнага факультэта, дацэнт В. А. Гайсёнак інфармаваў аб выкананні рашэнняў савета па далейшаму паляпшэнню інтэграцыі універсітэта з прамысловымі прадпрыемствамі, арганізацыямі і ўстановамі, а са справаздачай «Аб выніках работы студэнцкіх будаўнічых атрадаў у 1987 годзе і задачах па падрыхтоўцы да летняга семестра 1988 года» выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола па працоўнаму выхаванню В. Бойка.

На пасяджэнні вучонага савета разгледжаны некаторыя арганізацыйныя пытанні.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### ВЕЧАР ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДРУЖБЫ

арганізавалі студэнты І курса аддзялення гісторыі партыі гістфака ў інтэрнаце № 1. Пачаўся ён тэарэтычнай канферэнцыяй, на якой з паведамленнямі выступілі студэнты аддзялення М. Русу, Я. Міцюхіна, І. Стасеў, В. Брычыкаў, І. Бурчак, А. Лачвілава.

Потым былі канцэрт мастацкай самадзейнасці, выстаўка студэнцкіх кулінарных вырабаў, а ў канцы — чай: па-армянску, па-грузінску, па-казахску, па-туркменску.

Ч. ВІКТАРАЎ.

### ПЕРШЫНСТВО БДУ

па класічнай барацьбе вызначыла каманды-пераможцы. Адпаведна першае, другое і трэцяе месцы занялі юрфак, геафак і фізфак.

У асабістым першынстве ў розных вагавых катэгорыях мацнейшымі былі А. Кухарэнка (ФПМ), І. Судакоў, К. Буднік, Я. Навумчык, В. Бракарэнка (фізфак), А. Плотнікаў, А. Лашын, А. Крылісценка (юрфак) і П. Кірыльчук (геафак).

А. МАКСІМАЎ.



Гэта пра яго, Мікалая Рубанава, студэнта 1-й групы III курса пачулі мы на факультэце радыёфізікі і электронікі такія словы. Падзівіліся: не заўсёды такія аднадушныя ў сваіх выказваннях студэнты і выкладчыкі. А пачыналася ўсё, мабыць, з самай першай сесіі, калі ў заліковцы адна за адной паяўляліся пяцёркі. Здавалася, самі сабой. І ніхто не ведаў, колькі патрабавалася цярплівасці і настойлівасці. Зараз, перад наступнай сесіяй, таксама не абысціся без хвалявванняў: у час службы ў радах Узброеных Сіл старшыні Рубанаву было не да канспектаў і падручнікаў.

Пасля размовы з Колем зразумелі яшчэ і тое, як нялёгка быць старастам групы і старшынёй прафсаюзнага бюро адначасова, бо кожны дзень адчуваеш на сабе ўважлівыя позіркі сяброў:

— А як на гэты раз атрымаецца?

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

# Два пытанні дырэктару

НАВАТ першакурснік на пытанне: «Хто самы няўлоўны чалавек у студэнцкім гарадку?» дасць адказ адназначна:

— Зразумела, яго дырэктар.

Але сёння Аляксей Сяргеевіч Глагольеў «хаваўся» зусім недалёка: у пакоі з шыльдай «Дырэктар», што знаходзіцца на першым паверсе інтэрната № 2. А палове пятай я застаю яго на рабочым месцы, каб пачуць адказ на пытанні, якія хвалююць не толькі «інтэрнацкае» студэнцтва.

— Аляксей Сяргеевіч, ці адбыліся нейкія змены да лепшага ў жыцці інтэрнатаў за мінулы год?

— Упэўнена адказваю: адбыліся. Самае галоўнае, лічу, наладжванне новай прапускной сістэмы ў самых вялікіх інтэрнатах. Уведзена так званая сустрэчная сістэма прапускоў.

*Так, дырэктар мае на ўвазе іменна тую новую сістэму, пра якую гэтак крытычна выказваюцца многія студэнты. У чым жа справа?*

*Сустрэчная сістэма прапускоў дае свае вынікі пры наяўнасці апаратуры, якой павінен карыстацца вахцёр пры паведамленні аб каардынатах выклікаемага. Працуе ўстаноўка ў шостым, сёмым і другім інтэрнатах. Іншая справа, што ёю чамусьці не карыстаюцца. Думаю, таму, што госці проста не ведаюць пра яе існаванне.*

*Мне на памяць прыйшоў адзін выпадак. Неадкладна, запрасілі да тэлефона жыхара з другога паверха. Вахцёр жа шукала ў холе, хто б паклікаў студэнта да трубкі. Чаму ж прастойвае ўстаноўка?*

— Але новаўвядзенні не абмяжоўваюцца толькі гэтай сістэмай,— працягвае размову дырэктар.— У гэтым годзе плануецца часткова закупіць у інтэрнаты драўляныя ложкі, новыя тумбачкі, паліцы, у ленінскіх пакоях паставіць мяккую мэблю, карацей, палепшыць бытавыя ўмовы студэнтаў. У інтэрнаце № 2 будзем рабіць рамонт. І яшчэ. Ёсць адна прынцыпова новая думка: стварэнне будаўнічых атрадаў для работы ў інтэрнаце. У хуткім часе гэта пытанне будзем вырашаць.

— Напэўна, ёсць значная дапамога з боку...

— Студэнцкіх саветаў? — здагадаўся дырэктар.— Тут вы памыляецеся ў ацэнцы іх дзейнасці. Зразумела, ёсць і працавітыя, у прыватнасці студсаветы інтэрнатаў №№ 6, 7. Але ў цэлым у іх дзейнасці пераважае пасіўнасць, няўменне арганізаваць справу. Прыклад гэтаму — штодзённыя канфлікты з вахцёрам з-за адсутнасці прапускных дакументаў. Але, нягледзячы на такі значны «мінус», прэтэнзій з боку міліцыі Ленінскага раёна да інтэрнатаў БДУ няма.

Што ж, наогул аптымістычна скончылася інтэрв'ю. Дырэктар студгарадка ўжо заняты будзённымі, бягучымі пытаннямі.

Інтэрв'ю правяла Э. САЕВІЧ.

**НЯДАЎНА АДБЫЛАСЯ V партыйная канферэнцыя БДУ імя У. І. Леніна. На ёй заслухана справаздача парткома па кіраўніцтву перабудовай, з якой выступіў сакратар партыйнага камітэта М. І. Юрчук. У спрэчках выступілі: В. Л. Ламака — сакратар партыйнай арганізацыі хімічнага факультэта; Т. І. Прытыцкая — загадчыца кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў; Я. С. Варапай — загадчык лабараторыі НДІ ПФП, намеснік сакратара партбюро інстытута; В. П. Кузьмянкоў — дырэктар ІПК выкладчыкаў грамадскіх навук; А. Жук — сакратар камітэта камсамола універсітэта; Б. Папін — студэнт гістарычнага факультэта; А. А. Лойка — загадчык кафедры беларускай літаратуры; А. С. Міхалеў — загадчык кафедры кібернетыкі; Л. І. Кісялеўскі — рэктар універсітэта; М. І. Акімаў — дырэктар СКТБ з дsocледнай вытворчасцю; І. П. Чэпа — намеснік дэкана падрыхтоўчага факультэта, сакратар партыйнай арганізацыі.**

**У рабоце V партыйнай канферэнцыі БДУ імя У. І. Леніна прынялі ўдзел В. А. Пячэннікаў — сакратар ЦК КПБ; М. І. Даніловіч — намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ; М. А. Залескі — першы сакратар Маскоўскага РК КПБ; У. Д. Атрошчанка — загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Мінскага АК КПБ; В. У. Мулярчык — загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Мінскага ГК КПБ; М. М. Мяшкоў — міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.**

# Кур'ер канферэнцыі

## НАЙБОЛЬШ ШМАТЛІКІМІ

з'яўляліся дэлегацыі гістарычнага — 74 чалавекі, юрыдычнага — 72, фізічнага — 60, НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі — 46 чалавек.

## СЯРОД ДЭЛЕГАТАЎ

канферэнцыі два Героі Савецкага Саюза — камуністы Д. П. Жмуроўскі, М. Я. Зайцаў, ветэраны партыі В. С. Былінскі, А. В. Яраксін, Я. Ф. Плюта, старэйшыя работнікі універсітэта І. Р. Некрашэвіч, М. Т. Раманоўскі, Л. М. Шнеерсон, а таксама адзін акадэмік, чатыры члены-карэспандэнты Акадэміі навук БССР, восемдзесят адзін доктар навук, кандыдаты навук. Прысутнічалі два лаўрэаты Ленінскай прэміі, чатыры — Дзяржаўнай прэміі СССР, пяць — прэміі Савета Міністраў СССР, тры — Дзяржаўнай прэміі БССР, пяць — прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі, навукі і тэхнікі, культуры, работніка вышэйшай школы маюць 31 дэлегат.

## ПАСПЯХОВА СУАДНОСЯЦЬ

выдатную і добрую вучобу з актыўным удзелам у жыцці універсітэта 117 дэлегатаў-студэнтаў.

## ПАВЫШЭННЮ АКТЫЎНАСЦІ

жанчын у навуковай, вучэбнай і грамадскай рабоце універсітэта садзейнічае стварэнне жаночых саветаў. З агульнай колькасці дэлегатаў канферэнцыі жанчыны складаюць каля 23 працэнтаў. Сярод іх — восем дактароў навук, восемдзесят тры кандыдаты навук, дацэнты.

## НА КАНФЕРЭНЦЫЮ ВЫБРАНЫ

134 удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, якія са зброяй у руках абаранялі незалежнасць нашай Радзімы, а таксама воіны-інтэрнацыяналісты.

## ЗНАЧНЫ ЎДЗЕЛ

у вучэбна-выхаваўчай, навукова-даследчай і грамадска-палітычнай рабоце партыйных, савецкіх, камсамольскіх органаў, грамадскіх арганізацый прымаюць удзельнікі канферэнцыі. Сярод іх: адзін член ЦК КПБ, адзін член гарадскога і два раённага камітэтаў партыі, адзін дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, пяць дэпутатаў гарадскога і раённага Саветаў, трыццаць чатыры сакратары пярвічных партыйных арганізацый, трыццаць два члены парткома, 97 партгрупоргаў. Многія дэлегаты выконваюць абавязкі членаў партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх бюро.

ПЕРАДА МНОЙ — НЕВЫСОКІ БАР'ЕР. АЛЕ ЕН ЗДАЕЦЦА МНЕ ВЫШЭЙ І ДАЎЖЭЙ ЗА КІТАЙСКУЮ СЦЯНУ: ПА АДЗІН БОК Я— СА СВАІМІ, БЕЗУМОЎНА, РУЖОВЫМІ ЎЯЎЛЕННЯМІ ПРА КІНО; ПА ДРУГІ — ЯНЫ, ТЫЯ, ХТО ПРА КІНО ВЕДАЕ НЕ ПА ЧУТКАХ, А, БАДАЙ, УСЕ, ТАМУ ШТО ЯНЫ РОБЯЦЬ ЯГО.

НАТАТКІ ДЫЛЕТАНТА

# Пра кіно не па чутках



КІНО
КІНО
КІНО

## Пралог

КІНАСТУДЫЯ... Урэшце, мне пашанцавала і я змагу дакрануцца да гэтага фантастычнага, недасягальнага, заўсёды вабячага свету кіно. Сёння я зраблю ў ім першыя крокі. І кожны наступны дзень я буду прыходзіць у гэты свет, каб даведвацца пра яго ўсё больш і больш.

Маё знаёмства з кінастудыяй пачалося з ТА

## «Летапіс»

— аднаго са звенняў вялікага рабочага механізма «Беларусьфільма». Гэта — творчае аб'яднанне дакументальных, навукова-папулярных фільмаў і хронікі. Тут ствараюць кіналетапіс нашых дзён.

Ідэя адшукаць тут каго-небудзь па тэлефоне будзе недарэчнай. Асабліва рэжысёра: рэжысёр дакументальнага кіно (як, дарэчы, і мастацкага) не мае пастаяннага рабочага месца — кабінета, стала і г. д. На просьбу паклікаць яго да тэлефона вам абавязкова адкажуць: «Ён быў, але зараз ходзіць недзе...»

«Недзе» — гэта бясконцыя, складаныя, як лабірынт, калідоры, у якіх вядуцца не менш бясконцыя размовы і спрэчкі. Калі хочаш даведацца наконт апошніх навін беларускага кіно — дастаткова прагуляцца па калідоры міма мноства дзвярэй з таблічкамі, на якіх — назва карціны і прозвішча рэжысёра. Гэта — пакоі здымачных груп. Заканчваецца работа над стужкай, і пакой перадаецца іншым рэжысёрам і адміністратарам, паяўляюцца новыя таблічкі. А пакуль: «Пяць прэзідэнтаў» В. Рубінчыка, «Начны матрос» Л. Нячаева, «Дуброўскі» В. Нікіфарава і г. д. Але гэта — мастацкае кіно. У дакументалістаў рабочы кабінет — мантажны пакой. Тут, сярод чорных стужак кінаплёнкі, якія ўсцілаюць амаль усю падлогу, стаіць мантажны стол з маленькім экранчыкам, перад якім аўтары фільма, без перабольшання, праводзяць дні і ночы. Так, калі я паспрабавала раніцай знайсці Валерыя Давыдавіча Рубінчыка, каб узяць інтэрв'ю, мне адказалі: «Ён учора працаваў у начную...»

Кіно — дзіця стагоддзя, што падпарадкоўваецца законам эканомікі і вытворчасці. Таму і для кіно існуюць смета, расход, улік і план. Рэжысёр — слуга двух гаспадароў, якому заўсёды не хапае часу.

Паступова многае на студыі стала для мяне звыклым: людскі кругаварот у калідорах, змяшанне гукаў венскага вальса і хард-року, зусім фантастычныя касцюмы акцёраў, пахі лаку і свежай стружкі ў вялізных пячорах цёмных павільёнаў і г. д. Але немагчыма прывыкнуць да таго, што заўсёды хвалюе і абяцае мноства нечаканасцей. Гэта

## Здымкі

Малады рэжысёр Паша Пікман заканчваў работу над кіначасопісам «Савецкая Беларусь». Тэма апошняга сюжэта — наркаманія. «Кан'юнктура» — скептычна заўважыце вы. Аднак у беларускім кіно на сённяшні дзень гэтай праблеме не прысвечана ніводнай часткі (так завецца дзесяць мінут экраннага часу), таму П. Пікмана можна назваць своеасаблівым першаадкрывальнікам.

Чакаліся здымкі ў наркалагічным дыспансеры, псіхалагічнай бальніцы, аддзяленні міліцыі. Неабходны былі сустрэчы з хворымі, зусім маладымі хлопцамі і дзяўчатамі, з іх бацькамі, нервовымі, змучанымі людзьмі... Ад рэжысёра і аператара патрабавалася далікатная работа: амаль усе здымкі — схаванай камерай і з прытрымліваннем ананімнасці героя.

Былі складанасці, якія ёсць амаль на кожных дакументальных здымках: збянтэжанасць і нежаданне здымацца, боязь трапіць у крытычны сюжэт і г. д. А іншы раз перад намі проста зачыняліся дзверы, і тады ні лісты са студыі, ні ўмяшанне міліцыі не маглі дапамагчы іх адчыніць.

Так здарылася ў сёмым аддзяленні псіхіятрычнай лячэбніцы. У другім аддзяленні нам пайшлі насустрач, неабходны матэрыял быў такім чынам зняты. Аператар Саша Бароўскі «прагуляўся» камерай па закрытых кратамі вокнах і адмежаваных сеткай лесвічных праёмах. Здаецца, усё атрымалася. Але перад вачыма яшчэ доўга стаяў твар, які расчырванеўся ад «такой нахабнасці».

Магчыма, у класікаў усё было інакш. Але і яны вымушаны былі цягаць з сабой нязручную асвятляльную апаратуру (якасць айчыннай кінаплёнкі ніжэй усякіх ацэнак), любымі спосабамі пазбягаць стракатання кінакамеры і таксама адчувалі абмежаваны метраж плёнкі і малілі сваіх герояў выказаць думку як мага трапней і гаварыць карацей. Такое становішча было і застанецца, напэўна, яшчэ надоўга...

Навошта я раблю такое адступленне? Мне, дарагі чытач, вельмі хочацца, каб ты, гледзячы на экран, быў добразычлівым і ўважлівым. Сучаснае кіно — і дакументальнае, і мастацкае — звязана з такімі ўмовамі, з такой жорсткай у адносінах да здароўя кінематаграфістаў работай, што проста крыўдна за тваё неразуменне, а галоўнае, няўменне і нежаданне зразумець кінатвор.

Кінематограф перажывае новы час. Ён чакае гледача ўдумлівага, які ідзе на зваротную сувязь, які здольны і ацаніць вартасці, і ўбачыць шэрасць.

## Эпілог

Вось і ўсё. Я зноў па-за драўляным бар'ерам. У мінулым — выезды на здымкі, сустрэчы з рэжысёрамі, мастакамі, аператарамі. Успаміны, як клавішы раяля — белыя і чорныя, прымі хоць адзін і ўжо немагчыма будзе не сфальшывіць. А гэтага не хочацца рабіць нават у такіх кароткіх нататках, як гэтыя.

«Глядзі,— гаварылі мне сябры,— не разбі аб рэальнасць свае крыштальна чыстыя мары!» Але мае мары аказаліся больш блеклымі ў параўнанні з гэтай шматфарбавай, перапоўненай стрэсамі і натхненнем рэальнасцю.

Ж. МІХАЙЛАВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

НАШЫ СУСТРЭЧЫ

# АКТРЫСА

— МНЕ НЕЛЬГА скардзіцца: экран падарыў сустрэчы з дзіўнымі жаночымі лёсамі. За плячыма ўжо больш 40 такіх сустрэч — сярод іх жанчыны самыя розныя: шчаслівыя, няшчасныя, пакорлівыя, мяцежныя, якія любяць і ненавідзяць... Паверце, не імкнучыся быць арыгінальнай, я сапраўды не магу адказаць, якая з іх мне даражэй, таму што люблю ўсіх аднолькава, кожнай з іх аддадзена частка жыцця, дні і месяцы радасці, роспачы і надзеі. Тым больш гэтыя характары створаны цудоўнымі аўтарамі: Шолахавым, Маміным-Сібіраком, Шышковым, Сейфулінай, Каверыным, Купрыным, Трэнёвым...

Загадкавая Алеся, ганарлівая і непакорлівая Анфіса з «Угрум-ракі», верная Марфа з «Жураўліка», самаддадная Вірынея з аднайменнага фільма, знаходлівая журналістка са стужкі «На Гранатавых астравах», Таня Уласенкава з «Адкрытай кнігі»... А цяпер перад намі сама Людміла Аляксееўна ЧУРСІНА. Народная артыстка СССР. На гэты раз яна таворыць ад свайго ўласнага імя — пра тое, што яе хвалюе, радуе, што напаўняе яе жыццё.

— Як пісала А. Ахматава: «Есть три эпохи у воспоминаний, и первая — как бы вчерашний день...». Я б назвала сваю першую эпоху ўспамінаў — кінематаграфічнай. Шмат гадоў, каля пятнаццаці, я дастаткова поўна займалася кінематографам. У нейкі момант яму здрадзіла. Вельмі складана пастаянна матацца па ўсёй краіне ў цягніках і самалётах. І паколькі я ўсё-такі закончыла тэатральны інстытут і нават нейкі час працавала ў тэатры імя Вахтангава, то, натуральна, сум па сцэне зрабіў сваю добрую справу, і я вярнулася ў тэатр... Але пры гэтым вельмі ўдзячна кінематографу, які падарыў мне прызнанне і добрыя адносіны гледачоў, цэлы этап сустрэч у жыцці і, зразумела, на экране.



— Ваш дэбют у фільме «Данская аповесць» быў паспяховым...

— Імкнуся вельмі далікатна абыходзіцца з такімі паняццямі, як поспех, шчасце, перамога — мы зрабілі іх нейкімі звычайнымі словамі, не заўсёды па сутнасці і значнасці іх ужываем. Але сёння я магу сабе дазволіць іх выкарыстаць. І не пабаюся сказаць, што мой дэбют сапраўды быў паспяховым, шчаслівым. Але не дзякуючы мне. Гэтаму садзейнічаў цудоўны аўтар Міхаіл Шолахаў.

Гэты фільм як кросная маці для мяне. Тым больш я тады яшчэ была студэнткай IV курса тэатральнага інстытута. І ўпершыню мне на экране трэба было любіць, ненавідзець, здраджваць, станавіцца маці, паміраць. Я была падобна на чалавека, які не ўмее плаваць, калі яго кідаюць у ваду. Мне адразу давялося зразумець складанасць і адказнасць і вялікую працу, якіх патрабуе прафесія акцёра.

— Амаль што кожная дзяўчына марыць быць актрысай. А Вы, нам вядома, не збіраліся звязваць сваё жыццё з тэатрам і кіно — пасля заканчэння школы прыехалі ў Маскву паступаць у авіяцыйны інстытут...

— Так. У тэатральны пайшла «за кампанію» з сяброўкай. Экзамены не хвалявалі: мела сярэбраны медаль. Пачуццё страху, скаванасць мяне не прыгняталі — гэта, напэўна, і дапамагло. Калі прачытала сваё прозвішча ў спісах прынятых, падумала: паспрабую, а раптам?.. У МАІ паступіць заўсёды паспею. Але, як гаворыцца, уваход у кіно каштуе 50 капеек, а выхаду з яго няма.

— Што Вам у цяжар і што радуе ў прафесіі кінаакцёра?

— Засмучаюць адносіны да акцёра як да апошняй асобы на здымачнай пляцоўцы. Сумна і тое, што некаторыя рэжысёры часам не разумеюць і не могуць добра растлумачыць, чаму яны здымаюць іменна гэту карціну, што хвалюе, што сугучна ім у гэтым сцэнарыі.

У кіно акцёр працуе перад халодным позіркам кінакамеры. Іграе для гледача, але без гледача. На сцэне мы чуем ваш подых, вашы адносіны. Гэта своеасаблівы крытэрый нашай ігры. У кіно ж гэтага няма.

Дадам, што наша прафесія патрабуе двайной мужнасці, таму што кінематограф перш за ўсё жорсткі да акцёраў. Ён раптоўна можа ўзнесці і наадварот — аддаць забыццю. Невыпадкова некалі Ахматава сказала: «Молитесь на ночь, чтобы утром не проснуться знаменитым».

Першая мужнасць — прачнуўшыся вядомым, застацца спакойным да агеньчыкаў славы. І другая, больш моцная мужнасць патрабуецца, калі застаешся ў баку.

А радуе тое, што наша прафесія патрабуе імгненнай мабілізацыі ўсіх эмацыянальных, духоўных струн, дазваляе адчуваць неверагодную адказнасць за кожны крок, не дае расслабляцца. Калі ў тэатры нешта не атрымалася сёння, то гэта можна выправіць на апошніх спектаклях. У кіно зробленае ўжо не пераздымеш.

— Зараз Вы мала здымаецеся ў кіно...

— Па-першае, шмат нецікавага прапаноўваецца. Па-другое, пасля доўгага перапынку я зноў вярнулася ў тэатр — працавала ў Ленінградскім драмтэатры імя А. С. Пушкіна. Іграла горкаўскую Лізу Пратасаву у «Дзецях сонца», чэхаўскую Шурачку ў «Іванаве». А ў 1984 годзе перайшла ў Цэнтральны акадэмічны тэатр Савецкай Арміі: мяне запрасілі на ролю Настассі Пілiпаўны ў спектаклі па раману Ф. Дастаеўскага «Ідыёт». У ЦАТСА зараз іграю лэдзі Макбет у трагедыі Шэкспіра, у п'есе «Радавыя» — Веру Дугіну. А нядаўна мне ўпершыню даверылі вострахарактарную, гратэскавую ролю.

— Што, на Вашу думку, талент?

— Мне здаецца, талент — гэта вельмі яркая, прыродай дадзеная індывідуальнасць, плюс неверагодная праца.

— Гавораць, зараз знізілася патрабавальнасць гледача да акцёра: ён не абсвістває, не закідвае гнілымі памідорамі...

— Я не зусім згодна. Прыходзіць шмат лістоў у «Советский экран», «Искусство кино», дзе гледачы дастаткова кампетэнтна аналізуюць работу акцёраў. І «Кінапанарама», і творчыя сустрэчы, і маса літаратуры дапамагаюць гледачу разумець, што акцёр — чалавек залежны і нельга ва ўсіх няўдачах абвінавачваць яго.

— Вы такая прыгожая і маладая... У вас ёсць нейкі «рэцэпт» маладосці і прыгажосці?

— Я не скажу больш арыгінальна, чым сказаў Гётэ: «Бяздзейнае жыццё — гэта дачасная старасць». Таму работа і яшчэ раз работа.

Т. ПАДАЛЯК.
В. ЖАРЫНА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
7 студзеня 1988 г.
Зак. 1607.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.